# Уладзіслава АРЦЮКОЎСКАЯ



мастацкі кіраўнік Маладзёжнага тэатра эстрады, драматург, рэжысёр, уладальнік ордэна Францыска Скарыны

**1977**

Уладзіслава Ігараўна Арцюкоўская нарадзілася 14 чэрвеня 1977 года ў Мінску. Навучалася ў сярэдняй школе № 136 з тэатральным ухілам, дзе выкладала актрыса і рэжысёр Антаніна Аксёнава. Ужо ў гэты час напісала моладзевую п'есу "Пакуль зоркі не расталі", паставіла спектакль па ёй і атрымала прыз на дзіцячым фестывалі ў Брэсце.

**1995—2001**

Праходзіць падрыхтоўку на факультэце рэжысуры драмы Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў. Сярод настаўнікаў — Л. Манакова, А. Суцкавер, М. Кірычэнка, А. Андросік, Б. Луцэнка. Стажыруецца, вывучаючы чорны тэатр і тэатр ценяў у Германіі і камедыі дэль артэ ў Італіі. Удзельнічае ў майстар-класе народнага артыста Расіі, тэатральнага рэжысёра Л. Хейфеца, у арганізацыі і пастаноўцы традыцыйных баляў у Вене.

**2000-я**

Абараняе дыпломную работу на сцэне Маладзёжнага драматычнага тэатра. У 2000—2006 гадах працуе ў Рэспубліканскім тэатры беларускай драматургіі. З 2006-га — галоўны рэжысёр буйных дзяржаўных святочных мерапрыемстваў, сярод якіх "Славянскі базар", "Галоўная ёлка краіны", балі выпускнікоў і інш. З'яўляецца брэнд-дырэктарам у выставачнай кампаніі, ладзячы міжнародныя праекты.

**2009—2017**

За дасягненні на рэжысёрскай ніве атрымлівае Ганаровую грамату Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, граматы і падзякі Міністэрства культуры. З 2013-га кіруе аб'яднаннем "Талент". Стварае дзіцячыя спектаклі "Фрэкен Бок вяртаецца", "Кот Матроскін", а таксама пастаноўкі для дарослых "Джэнтльмены", "Пагуляем у каханне".

**2018**

З 2018-га па сёння — мастацкі кіраўнік Маладзёжнага тэатра эстрады, у якім дала жыццё шэрагу спектакляў. Сярод іх — мюзікл-прытча "Як ноч стала дзяўчынай", мюзікл-дэтэктыў "Джэк Патрашыцель", мюзікл "Бурлеск", імерсіўны мюзікл "Стрыптыз душы", біяграфічны мюзікл "Гур'янаў", музычная камедыя "Брыялін".



Сцэна з пастаноўкі "Бурлеск"



Мюзікл-дэтэктыў "Джэк Патрашыцель"



Сцэна са спектакля "Гур'янаў"

**2018—2021**

З 2018-га па 2021-ы працуе педагогам на кафедры рэжысуры БДУКМ. За напісанне і пастаноўку мюзікла-дэтэктыва "Джэк Патрашыцель" у намінацыі "Найлепшы музычны спектакль, мюзікл" атрымлівае Нацыянальную тэатральную прэмію, граматы і падзякі Міністэрства культуры.

Стварае буйныя культурныя праекты. Напрыклад, выступае аўтарам і рэжысёрам "Венскіх баляў" у Палацы Незалежнасці, якія ладзіліся з 2018 па 2022 год, галоўнага канцэрта "Александрыя збірае сяброў" (2021—2023), а таксама спартыўна-культурнага фестывалю "Вытокі", які цяпер праходзіць у гарадах Беларусі.

**2022**

За выдатныя дасягненні ў прафесійнай дзейнасці і значны асабісты ўклад у развіццё тэатральнага мастацтва ўганаравана медалём Францыска Скарыны.

Маладзёжны тэатр эстрады пад кіраўніцтвам Уладзіславы Арцюкоўскай працягвае гастрольны тур са спектаклем "Гур'янаў". Сёлета ён ужо быў паказаны на сцэнах "Славянскага базару" ў Віцебску, Палаца Рэспублікі ў Мінску, у Магілёве. Пастаноўку яшчэ прапануюць гледачам у Жодзіне, Брэсце, Барысаве, а таксама ў Санкт-Пецярбургу і ў наступным годзе — у Маскве.

**2023**

Зараз Уладзіслава Арцюкоўская шчыруе над аўтарскай камедыяй "Асцярожна, кекс!" з удзелам зорак: Уладзіміра Варанкова і Аляксандры Гайдук. Спектакль сёлета з'явіцца на сцэне Маладзёжнага тэатра эстрады. Яшчэ рэжысёр рыхтуе пастаноўку пад працоўнай назвай "Пакуль дыхаю, спадзяюся" па матывах жыцця ваеннага контрразведчыка часоў Вялікай Айчыннай. Твор будзе прысвечаны тэме вернасці, сумленнасці і любові.

Піша падручнік па рэжысуры. Арганізоўвае ўнікальнае мерапрыемства — баль БЕЛАЗа, прымеркаваны да 75-годдзя завода. Імпрэзу правядуць 16 верасня ў цэху, дзе вырабляюцца самыя буйныя ў свеце самазвалы.

Сёння Уладзіслава Арцюкоўская — адзін з найбольш заўважных тэатральных дзеячаў. Яна напісала звыш 100 твораў на рускай і беларускай мовах — п'есы, мюзіклы, апавяданні, песні. Таленавіты рэжысёр і драматург працягвае па-майстэрску ўвасабляць смелыя дзяржаўныя праекты і ставіць сучасныя, крэатыўныя спектаклі.




Анонс:
18 жніўня Маладзёжны тэатр эстрады выступіць з музычнай камедыяй "Брыялін" на фестывалі "Вытокі" ў Касцюковічах. Тэатральны сезон у Мінску для калектыву адкрыецца 14 верасня.